

Міжнароднаму году жанчыны прысвечана выстаўка кніг, якая адкрылася ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна. У пяці тэматычных раздзелах выстаўкі экспануюцца больш чым 700 кніг, часопісаў, плакатаў.

НА ЗДЫМКУ: з экспанатамі выстаўкі знаёмяцца (справа налева): паэтэса, галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка» Еўдакія ЛОСЬ, паэтэса Эдзі АГНЯЦВЕТ, выхавацельніца дзіцячага сада № 239 г. Мінска Раіса МАРТЫНЧУК, намеснік старшыні прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі, член камісіі па правядзенню Міжнароднага года жанчыны Валянціна ЧАРНЯЎСКАЯ і студэнтка Мінскага радыётэхнічнага інстытута Ала ЕЎТУШЭНКА.

Фота І. Юдаша. (БЕЛТА).